Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце БДУКМ
_________________С.Л.Шпарло
«18» 05 2023 г.
Рэгістрацыйны № ВД-578/эвуч.

# МЕТОДЫКА АРГАНІЗАЦЫІ ФАЛЬКЛОРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
для спецыяльнасці
1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),
напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор),
спецыялізацыі 1-18 01 01-05 01 Этнафоназнаўства

2023

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі І ступені па спецыяьнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12 красавіка 2022 г. № 78, вучэбнага плана БДУКМ па напрамку спецыяльнасці, спецыялізацыі.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*Т.А.Пладунова*, дацэнт кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Петухова Н.В.*, загадчык кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук;
*Касцяневіч Н.У.,* загадчык аддзяленнем народнай творчасці ДУА «Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь» г. Мінска, педагог дадатковай адукацыі, кіраўнік фальклоргнага калектыва «Мілавіца».

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (протокол № 6 ад 26.12.2022);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (протокол № 5ад 15.03.2023).

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці» распрацавана для студэнтаў напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 «Фальклор», спецыялізацыі 1-18 01 01-05 01 «Этнафоназнаўства».

Вучэбная дысцыпліна «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці» разглядае шляхі і сродкі па засваенні і адаптацыі беларускіх абрадавых і пазаабрадавых традыцый у сучасным культурным жыцці, выпрацаваныя айчыннымі фалькларыстамі і этнапедагогамі.

Вучэбная дысцыпліна «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці» цесна ўзаемасвязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі як: «Фальклорны практыкум», «Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства», «Каляндарна-абрадавая творчасць», «Сямейна-абрадавая творчасць», «Пазаабрадавая творчасць», «Міфалогія», «Этнаграфія» і інш. Ва ўзаемадзеянні названых профільных дысцыплін спецыялізацыі вучэбная дысцыпліна «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці» заклікана ажыццяўляць асноўныя палажэнні па ахове, зберажэнні і пераемнасці беларускіх абрадавых і сацыяльна-побытавых традыцый у сучаснай сацыякультурнай прасторы, аналізуе формы і метады ўкаранення іх у кантэкст сучаснай мастацкай культуры ў якасці эстэтычна арганізаванай традыцыі, якія назапашаны ў XX–XXI стст. і выбудоўваюцца сёння ў рамках прафесійнай і аматарскай этнакультурнай дзейнасці.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – узбагачэнне будучых спецыялістаў па фальклоры тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі па засваенні і рэвіталізацыі каляндарных і сямейных абрадавых свят, пазаабрадавых побытавых практык шляхам іх мастацкага рэканструявання на рэгіянальнай дакументальнай аснове.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– фарміраванне ў студэнтаў навуковага падыходу, эстэтычных крытэрыяў і творчай матываванасці да вывучэння і ўвасаблення абрадавых і пазаабрадавых традыцый у рэчышчы іх мастацкага рэканструявання;

– авалоданне асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй, звязанымі з вывучэннем каляндарных і сямейна-абрадавых цыклаў, пазаабрадавых побытавых практык і прымеркаваных да іх танцавальна-гульнявых, бяседных дзей;

– раскрыццё функцыянальна-семантычнага зместу, жанравага саставу каляндарных і сямейна-родавых свят і абрадаў;

– асэнсаванне працэсаў устойлівасці і пераемнасці, эвалюцыі і сучасных трансфармацый каляндарных і сямейна-родавых свят, пазаабрадавых побытавых практык беларусаў;

– выпрацоўка практычных уменняў і навыкаў арганізацыі і правядзення каляндарных і сямейна-абрадавых свят і дапасаваных да іх рэкрэацыйных дзей у сучасных умовах;

– фарміраванне аналітычнай кампетэнцыі і творчага мыслення на даследчым, сцэнарна-праектным і арганізацыйна-рэпетыцыйным этапах мастацкага ўвасаблення каляндарных і сямейна-родавых абрадаў, пазаабрадавых побытавых дзей, танцавальна-гульнявых і фальклорна-тэатралізаваных відовішчаў.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці» павінна забяспечыць фарміраванне спецыялізаванай кампетэнцыі: валодаць навыкамі рэвіталізацыі каляндарных і сямейных абрадавых свят, пазаабрадавых бытавых практык і іх мастацкай рэканструкцыі на рэгіянальнай дакументальнай аснове.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя тэарэтычныя паняцці, якія разглядаюцца ў межах дысцыпліны;

– асноўныя методыкі даследавання фальклорнай традыцыі;

– навуковую спадчыну найбольш вядомых збіральнікаў і даследчыкаў беларускага фальклору;

– абрадавую карту і сакральную тапаграфію беларусаў;

– законы вуснай перадачы фальклорнай традыцыі;

– рэгіянальныя асаблівасці беларускіх народных традыцый;

– асноўныя методыкі па засваенні і рэвіталізацыі фальклорнай спадчыны ў аматарскай творчасці;

– навуковыя падыходы па класіфікацыі беларускіх каляндарных і сямейна-родавых абрадаў і сістэматызацыі іх структурных элементаў;

– гісторыю і асноўныя кірункі даследавання гульнявых, каляндарных і сямейна-родавых традыцый беларусаў;

– агульную характарыстыку, функцыянальна-семантычны змест, жанравы састаў традыцыйных гульняў, абрадаў і свят, пазаабрадавых побытавых практык;

– рэгіянальныя асаблівасці абрадаў каляндарнага і сямейна-родавага цыклаў і арэал іх бытавання;

– метады мастацка-практычнай фалькларыстыкі па ўвасабленні вуснай народнай творчасці;

*умець:*

– праводзіць фальклорную палявую практыку;

– фіксаваць на лічбавых носьбітах, расшыфроўваць і архіваваць экспе-педыцыйныя матэрыялы;

– арыентавацца ў жанравых асаблівасцях фальклорнай спадчыны беларусаў;

– аналізаваць мастацка-вобразную сістэму фальклорных жанраў;

– арганізоўваць і кіраваць працэсам развучвання традыцыйных спеваў;

– улічваць творчыя асаблівасці традыцыйных спеваў пры стварэнні канцэртных праграм, сацыякультурнай дзейнасці, дзейнасці па этнакультурным выхаванні;

– самастойна аналізаваць каляндарныя і сямейна-родавыя абрады, выбудоўваць архітэктоніку дзеі паводле іх структурных элементаў (кодаў);

– праектаваць сцэнарый на аснове акцыянальных кодаў абраду з улікам яго тэмпаральнага, лакатыўнага, персанальнага, атрыбутыўнага, музычна-вербальнага, музычна-інструментальнага, пластычнага кодаў;

– складаць рэпертуарныя зборнікі фальклорных матэрыялаў;

– арганізоўваць і ўвасабляць абрадавую дзею, рэкрэацыйныя, гульнявыя практыкі ў рэчышчы іх мастацкага рэканструявання на дакументальнай аснове;

– ажыццяўляць рэпетыцыйны працэс з гуртамі-ілюстратарамі фальклорнай мастацкай дзеі;

– арганізоўваць працу па якасным тэхнічным забеспячэнні фальклорнай мастацкай дзеі;

*валодаць:*

– сучасным тэрміналагічным слоўнікам навуковай і народнай тэрміналогіі па арганізацыі пераймання мастацтва вуснай традыцыі;

– метадамі распрацоўкі абрадавай карты свята;

– прыёмамі дакументавання фальклорных адзінак.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны - «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці» усяго адведзена 678 гадзін, з якіх 302 аўдыторныя (60 – лекцыі, 120 – практычныя, 122 – семінарскія) заняткі.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Змест і задачы вучэбнай дысцыпліны. Фальклорная дзейнасць як галіна сацыяльна-культурнай дзейнасці па засваенні і актуалізацыі народных традыцый, арганізацыі і змястоўным напаўненні жыцця і побыту сучаснага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь на іх падмурку.

Збіральніцкая і даследчая праца як перадумовы пісьменнай фальклорнай дзейнасці спецыялістаў па фальклоры.

Беларускія абрадавыя і пазаабрадавыя побытавыя традыцыі як адлюстраванне быцця родавай абшчыны ва ўсіх яго праявах: у абрадах і звычаях жыццёвага цыкла, у аграрнай і працоўнай дзейнасці, побыце, сямейных і грамадскіх узаемаадносінах людзей, іх вераваннях, інтарэсах і душэўных перажываннях.

Уключэнне самабытных абрадавых традыцый і побытавых рэкрэацыйных практык у сучасны сацыякультурны кантэкст Беларусі.

## Раздзел І. Метады мастацка-практычнай фалькларыстыкі па засваенні і рэвіталізацыі традыцыйных абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык

### *Тэма 1. Абрадавая практыка як арганізацыя мыслення і паводзін традыцыйнага грамадства*

Абрадавая традыцыя як эмацыянальна збалансаваная сістэма жыццятворчасці соцыуму ў прыродным асяроддзі.

Каляндарныя і сямейна-родавыя абрадавыя практыкі як арганізацыя мыслення і паводзін людзей – у сумеснай працы, маленні звышнатуральным сілам аб ураджаі, плёне ў гаспадарцы і сям'і, абагаўленні сіл прыроды.

Матывацыя абрадавых практык (вербальных, этнафанічных, пластычных, маскіравання) у традыцыйнай супольнасці – забеспячэнне збалансаванасці быцця соцыуму ў рытме з прыроднымі і жыццёвымі цыкламі. Функцыянальнасць традыцыйных абрадаў.

### *Тэма 2. Эстэтычная і этнаэкалагічная аснова засваення абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык у вучэбна-выхаваўчай і сацыякультурнай дзейнасці*

Эстэтычная канцэпцыя рэканструявання народных мастацкіх традыцый метадамі мастацка-практычнай фалькларыстыкі беларускага філосафа У.М. Конана. Эстэтычная самадастатковасць і сугестыўнасць фальклорнай традыцыі. Этнаэкалагічны патэнцыял беларускіх абрадавых і пазаабрадавых

традыцый. Выхаваўчая роля каляндарных і сямейных абрадаў у сучаснай вучэбна-выхаваўчай і сацыякультурнай дзейнасці.

Актуалізацыя абрадавых свят і пазаабрадавых побытавых практык як развітой мастацкай сістэмы. Шляхі і перспектывы іх увядзення ў кантэкст сучаснай мастацкай культуры ў якасці эстэтычна арганізаванай традыцыі. Тэарэтычная і практычная распрацоўка метадаў мастацка-практычнай фалькларыстыкі навукоўцамі і этнапедагогамі краіны. Арганізацыя фальклорнай дзейнасці як сацыяльна значная практыка этнакультурнай ідэнтыфікацыі, духоўнага ўмацавання інстытута сям'і.

*Тэма 3. Збіранне і даследаванне беларускага фальклору*

Агляд важнейшых публікацый і даследаванняў беларускага фальклору.

Асноўныя прынцыпы збірання і вывучэння беларускай народнай творчасці. Гісторыка-тэарэтычнае вывучэнне жанраў і відаў беларускага фальклору ў працах вядомых беларускіх і замежных фалькларыстаў.

Цэнтры збірання і комплекснага вывучэння беларускага фальклору. Перыядычныя і неперыядычныя выданні. Збіранне і даследаванне беларускага фальклору выкладчыкамі, аспірантамі і студэнтамі УВА Беларусі. Выданне зборнікаў рэгіянальнага фальклору. Падручнікі і дапаможнікі па беларускай вусна-паэтычнай творчасці. Праграмы-апытальнікі для фальклорнай практыкі студэнтаў.

*Тэма 4. Методыка даследавання абрадавых традыцый*

Методыка даследавання традыцыйных абрадаў расійскіх вучоных М.І. і С.М.Талстых. Архітэктоніка абрадавай дзеі як сукупнасць раўназначных па функцыянальна-семантычнай нагрузцы кодаў: тэмпаральны код – час правядзення абраду (свята); акцыянальны код – ход абрадавых падзей; лакатыўны код – месца правядзення абраду (свята); персанальны код – кола ўдзельнікаў, наяўнасць маскіраваных персанажаў; атрыбутыўны код – выкарыстанне абрадавых атрыбутаў, адзення, маскіравання; музычны код – тыпавыя напевы з адмысловымі этнафанічнымі прыкметамі і гукаідэал інструментальнай этнафоніі; вербальны – наяўнасць заклікаў, замоў, зычанняў, праклёнаў, дыялогаў у абрадзе, сакральны смех, маўчанне.

Узоры класіфікацыі і сістэматызацыі абрадавых свят айчынных фалькларыстаў А.С.Ліса, У.А.Васілевіча, А.Ю.Лозкі, В.Д.Ліцвінкі, З.Я.Мажэйкі, Г.А.Барташэвіч і інш.

### *Тэма 5. Аматарская фальклорная дзейнасць як фактар захавання і пераемнасці беларускіх абрадавых і пазаабрадавых традыцый*

Аматарскія фальклорныя калектывы і іх роля ў захаванні і трансляцыі народных традыцый. Сістэматызацыя тыпаў і форм фальклярызму па ўвасабленні фальклорнага мастацтва ў аматарскай творчасці

Структурныя падраздзяленні сістэмы культуры і адукацыі, закліканыя ажыццяўляць ахову і зберажэнне аўтэнтычных традыцый, працэс іх пераемнасці і папулярызацыі (раённыя і абласныя аддзелы культуры і адукацыі, арганізацыйна-метадычныя цэнтры, палацы культуры, дамы фальклору, цэнтры народнай творчасці, установы дадатковай адукацыі, музеі).

Стварэнне фальклорнага гурта як творчага калектыву па вывучэнні, засваенні і папулярызацыі народных мастацкіх традыцый, абрадаў і свят. Перспектыўнае планаванне навукова-метадычнай, вучэбна-выхаваўчай і рэпетыцыйнай работы, канцэртна-святочнай дзейнасці фальклорнага гурта.

### *Тэма 6. Засваенне традыцыйных абрадаў і свят у аматарскай творчасці*

Метады мастацка-практычнай фальклярыстыкі па вывучэнні, засваенні і ўвасабленні традыцыйных абрадаў і свят у аматарскай творчасці: метады вуснай перадачы і ўключанага назірання, тэхнічна апасродкаваны (аўдыявідэа) ілюстратыўны метад; метады этнафанічнага аналізу і транскрыпцыі аўтэнтычнага музычнага ўзору; метад сінхроннага выканання-імітацыі музычнага, харэаграфічнага ўзору сумесна з аўтэнтычнымі выканаўцамі (з аўдыявідэастужкі), метады паказу педагога-лідара гурта, практыкаванняў і самастойнай работы; метады эмпатыі і творчай імправізацыі.

Этапы засваення, арганізацыі і правядзення абрадавага свята.

*Падрыхтоўча-даследчы этап.* Тэарэтычны аналіз абрадавай традыцыі і яе рэгіянальных адметнасцей. Збор факталагічнага матэрыялу, пашпартызацыя фальклорных узораў. Складанне абрадавай карты свята, у якой прыведзена сістэматызацыя яго структурных кампанентаў (кодаў) паводле прапанаванай методыкі М. І. і С. М. Талстых, на аснове іншых падыходаў айчынных і замежных фалькларыстаў. Расшыфроўка і сістэматызацыя песенных і вербальных тэкстаў абраду.

*Арганізацыйна-метадычны этап.* Афармленне падабраных этнафанічных, вербальных, танцавальна-гульнявых узораў у рабочы рэпертуарны зборнік альбо ў фанатэку. Складанне сцэнарыя паводле акцыянальных кодаў абрадавага свята з больш дэталёвым пазначэннем ходу абрадавых падзей і асобных момантаў свята, часу і месца іх правядзення; кола ўдзельнікаў і

завадатараў свята, абрадавых персанажаў, маскіравання і атрыбутыкі; зместу прымеркаванай да свята рэкрэацыйна-забаўляльнай часткі. Рэжысёрскае вырашэнне кожнага з эпізодаў свята.

*Вучэбна-рэпетыцыйны этап.* Стварэнне фальклорнай групы выканаўцаў-ілюстратараў адпраўлення абраду, засваенне ёй адпаведнага песеннага, музычнага, харэаграфічнага, гульнявога, тэатральнага матэрыялу (з рабочага рэпертуарнага зборніка), выраб касцюмаў і святочнай атрыбутыкі, размеркаванне роляў у абрадавай дзеі, вызначэнне лідараў-завадатараў свята і адказных па арганізацыйных пытаннях. Рэжысёрскія прыёмы ўвасаблення абрадавай дзеі і актывізацыі яе ўспрымання гледачом.

*Прэзентацыйна-творчы этап.* Мастацкая рэканструкцыя свята ў натуральных умовах бытавання. Канцэртная праграма паводле рэгіянальных каляндарных абрадаў.

*Аналітычны этап.* Аналіз зробленай мастацка-фалькларыстычнай працы, яе дакументаванне і архівацыя, папулярызацыя ў СМІ.

### *Тэма 7. Інавацыйныя формы і метады арганізацыі фальклорнай дзейнасці*

Формы і метады ўключэння грамадства ў святочна-абрадавую цыклічнасць традыцыйнай культуры.

Дзяржаўныя і грамадскія этнавыхаваўчыя праекты на аснове традыцыйнай народнай культуры. Фестывалі традыцыйнага мастацтва як рычаг стымулявання творчай дзейнасці калектываў у этнакультурным рэчышчы. Майстар-класы і школы традыцыйнага мастацтва. Фальклорныя летнікі і этнадыскатэкі, тэматычныя вечарыны і выставы, кіналекторыі і этнаграфічныя канцэрты, тэле-, радыёпраграмы. Народныя святы ў вёсцы і горадзе, фолькмадэрн праекты паводле абрадавых і пазаабрадавых традыцый.

## Раздзел II. Мастацкая рэканструкцыя каляндарных, сямейна-родавых абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык

### *Тэма 8. Праблемы бытавання і рэканструявання традыцыйных абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык на сучасным этапе*

Сучасны стан аўтэнтычных абрадавых традыцый у Беларусі. Другасныя фалькларызаваныя формы бытавання і ўзнаўлення народных свят. Паняцці «рэканструкцыя», «рэстаўрацыя», «стылізацыя» ў навукова-даследчых працах мастацтвазнаўцаў і фалькларыстаў, метадычных распрацоўках рэжысёраў свят.

Мастацкая рэканструкцыя абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык як сучасна адаптаванае ўзнаўленне традыцыйных дзей на рэгіянальнай дакументальнай аснове з захаваннем іх драматургічнай асновы, вербальных, этнафанічных, пластычных і драматычных кампанентаў.

Асноўныя прынцыпы мастацкай рэканструкцыі абраду: дакладнасць увасаблення абраду, вуснасць пераймання ўсіх яго кампанентаў, актуальнасць функцыянальнага зместу абраду ў сацыяльна-культурным і эстэтычным запатрабаванні грамадства.

Этапы мастацкай рэканструкцыі абраду: складанне абрадавай карты сістэматызацыі кодаў абраду (святочнай дзеі) і сцэнарнае праектаванне на яе аснове; рэжысёрскі аналіз і мізансцэніраванне абрадавай дзеі; фарміраванне фанатэкі і рэпертуарнага зборніка да сцэнарыя; рэпетыцыйна-пастановачная работа з гуртом-ілюстратарам абрадавай дзеі па яе ўвасабленні.

*Тэма 9. Мастацкая рэканструкцыя абрадаў і свят зімовага цыкла*

Абрады калядавання-шчадравання ў рэгіёнах Беларусі.

Мастацкая рэканструкцыя абрадавай гульні «Жаніцьба Цярэшкі» на Падзвінні, каляднага абходу з «Казой» на Палессі, «Ражстоўскага абходу Хрыстаславаў» на Панямонні. Мастацкая рэканструкцыя беларускага народнага тэатра «Батлейка» – лялечнага тэатра рэлігійна-містэрыяльнага зместу (паводле гісторыі нараджэння Хрыста) з уключэннем народных інтэрмедый.

Канцэртна-сцэнічная версія калядных прадстаўленняў.

*Тэма 10. Мастацкая рэканструкцыя абрадаў і свят веснавога цыкла*

Мастацкая рэканструкцыя абрадавых цырымоній Масленіцы, Гукання вясны, Вялікадня, Юр’я, Ушэсця паводле рэгіянальных традыцый.

Канцэртна-сцэнічная версія абрадавых праграм веснавога цыкла.

*Тэма 11. Мастацкая рэканструкцыя абрадаў і свят летняга цыкла*

Мастацкая рэканструкцыя траецкіх абрадавых цырымоній паводле рэгіянальных традыцый: «Кумленне» на Падзвінні і Падняпроўі, «Ваджэнне Куста» на Брэсцкім Палессі, «Провады Русалкі» на Гомельскім Палессі.

Мастацкая рэканструкцыя Купалля на аснове рэгіянальных традыцый. Адметнасці купалавання на Падзвінні, Падняпроўі і Брэсцкім Палессі.

Канцэртна-сцэнічныя праграмы паводле рэгіянальных абрадавых цырымоній Зялёных святак і Купалля.

*Тэма 12. Мастацкая рэканструкцыя абрадаў
і свят летне-восеньскага цыкла*

Рэжысёрскі аналіз абрадаў жніўнага цыкла (зажынкі і дажынкі). Рэгіянальныя асаблівасці абрадавых цырымоній: «Пакрыванне поля», «Завіванне дажынкавага вянка», «Завіванне барады», рытуалы ўшанавання зажынкавага і дажынкавага снапоў, качання на ніве, інш. Мастацкая

рэканструкцыя абрадаў жніўнага цыкла. Рэжысёрскі аналіз восеньскіх абрадаў «Жаніцьба коміна», «Багач», «Дзяды».

Мастацкае ўвасабленне абрадаў і свят летне-восеньскага цыкла.

*Тэма 13. Традыцыі бытавання і перспектывы мастацкага рэканструявання сямейна-родавых абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык*

Сямейна-абрадавая практыка як арганізацыя мыслення і паводзін людзей паводле асноўных этапаў жыццёвага цыкла чалавека: нараджэння, уступлення ў шлюб, смерці. Адлюстраванне гэтых этапаў у трох абрадавых цыклах сямейна-родавага круга: радзінах, вяселлі, пахаванні.

Абрадавыя і побытавыя традыцыі сямейна-родавага цыкла як эмацыянальна збалансаваная сістэма жыццядзейнасці соцыуму. Матывацыя сямейна-абрадавых і пазаабрадавых побытавых практык (вячорак, ігрышчаў, гасцяванняў, вечарынак, бясед) у традыцыйнай супольнасці – забеспячэнне збалансаванасці быцця соцыуму ў рытме з жыццёвымі цыкламі чалавека. Рэгулятыўная роля сямейна-родавых абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык у быцці сямейна-родавай абшчыны. Этнаэкалагічны фактар іх увядзення ў кантэкст сучаснай культуры.

*Тэма 14. Сістэматызацыя рытуалаў радзінна-хрэсьбіннага абрадавага цыкла*

Радзінна-хрэсьбінны абрадавы цыкл, яго полісастаўнасць і жанравая дыферэнцыяцыя кампанентаў. Адлюстраванне ў музычна-паэтычным змесце радзінных песень асноўнага сэнсу сямейна-абрадавай цырымоніі – далучэння дзіцяці да родавай і сямейнай абшчыны.

Адлюстраванне асноўных этапаў абраду і іх эмацыянальнай нагрузкі ў песнях: велічальна-віншавальных, адрасаваных нованароджанаму, яго бацькам і родным; жартоўных – да бабкі-павітухі, кума і кумы; лірыка-эпічных і застольных, якія выконваюцца падчас абрадавай трапезы.

Абрадавая рэгламентацыя паводзін удзельнікаў і герояў урачыстасці (бацькоў, кумоў, бабкі-павітухі). Абрад падзелу «бабінай кашы» як кульмінацыйны момант радзінна-хрэсьбіннай урачыстасці, карнавальныя рысы народна-смехавой культуры ў яго імправізаваных сцэнах (пераапрананне, жарты), маральна-павучальны кампанент абраду (разнастайныя пажаданні нованароджанаму) .

Рэгіянальныя адметнасці радзінна-хрэсьбіннай абраднасці.

*Тэма 15. Сістэматызацыя рытуалаў*
*вясельнага абрадавага цыкла*

Вясельны абрадавы цыкл. Развітасць комплексу вясельных абрадавых цырымоній, музычная разнастайнасць і насычанасць этнафанічнай партытуры вяселля. Драматургія вяселля, разгорнутага ў часе (на працягу некалькіх тыдняў) і ў прасторы (у хаце маладога, у хаце маладой). Асноўныя этапы вяселля: *перадвясельны этап* (сватанне, запоіны, заручыны, зборная субота); *уласна вяселле* (выраб каравая, пасад, прыезд дружыны жаніха па нявесту, вясельнае застолле, дзяльба каравая, ад'езд да дому маладога, сустрэча маладых, вяселле ў хаце маладога); *паслявясельны этап* (пярэзвы – узаемныя гасцяванні маладых, іх бацькоў і сваякоў). Вясельныя «чыны» і абрадавая рэгламентацыя іх паводзін.

Гістарычны генезіс і рэгіянальныя адметнасці вясельных цырымоній у Беларусі. Правядзенне вяселля па старажытным стаўбавым рытуале (паўночна-ўсходняе Падзвінне); вясельнае дзейства па каравайным рытуале (пераважнае распаўсюджанне ў Беларусі).

*Тэма 16. Сістэматызацыя абрадавых цырымоній*
*ушанавання продкаў*

Абрадавыя цырымоніі ўшанавання продкаў: пахавальныя звычаі ў Беларусі; памінанне памерлых (памінкі сітуацыйныя (на 3, 9, 40 дзень пасля пахавання) і каляндарныя (Дзяды масленічныя, велікодныя, траецкія, купальскія, восеньскія, зімовыя (тры куцці на Каляды).

Абрадавыя рэгламентацыі паводзін удзельнікаў азначаных памінальных цырымоній.

*Тэма 17. Пазаабрадавыя побытавыя практыкі*
*сямейна-родавага цыкла*

Пазаабрадавыя практыкі ў кантэксце рэгулявання сямейна-родавых узаемаадносін.

Творы фальклорнага дзяцінства (пацешкі, калыханкі, лічылкі, дражнілкі, гульні, карагоды) як школа маральнага, эстэтычнага выхавання, псіхафізічнага развіцця дзіцяці і як фактар уключэння яго ў соцыум. Вершаваныя і празаічныя, песенныя, гульнявыя і негульнявыя жанры дзіцячага фальклору, іх функцыянальнае прызначэнне і мастацкія асаблівасці.

Танцавальна-гульнявыя ігрышчы, якія спрыялі знаёмству хлопцаў і дзяўчат. Абрадавыя і прымеркаваныя па часе і абставінах гульні нежанатай моладзі («Яшчар», «Бахар», «Жаніцьба Цярэшкі», «Халімон», «Падушачка», «Удавец», «Цяцерка», «Баяры», інш.). Вусна-паэтычная і музычна-харэаграфічная аснова танцавальна-гульнявых ігрышчаў. Прыпеўкі да традыцыйных танцаў.

Пазаабрадавыя і прымеркаваныя па часе і абставінах бяседы, гасцяванні, вячоркі і вечарыны. Провады ў войска. Музычна-песенная аснова традыцыйнай бяседы ў Беларусі. Тэматычныя групы песень, выконваемых у бяседзе: сямейна-бытавыя, любоўныя, лірычныя балады, сацыяльна-бытавыя, жартоўныя, гульнявыя і танцавальна-прыпевачныя. Эмацыянальны змест і драматургія казацка-сялянскай сацыяльнай лірыкі. Традыцыі сольнага і харавога выканальніцтва.

## Раздзел III. Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка і ўвасабленне традыцыйных абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык

*Тэма 18. Рэжысёрскі аналіз традыцыйнага абраду*

Гісторыка-рэтраспектыўны аналіз развіцця народных свят і абрадаў як старажытных містэрый. Выяўленне агульнанацыянальных заканамернасцей, рэгіянальных і мясцовых адметнасцей абраду.

Рэжысёр і рэжысёрскае майстэрства. Рэжысёрскі аналіз традыцыйнага абраду: ідэйна-тэматычны аналіз; архітэктоніка абраду як паслядоўнасць разгортвання яго функцыянальна-семантычных кодаў у прасторы і часе; суразмернасць, лагічнасць альбо кантраснасць частак (этапаў) абрадавай дзеі; умоўна-прымеркаваная да абраду рэкрэацыйная частка (танцавальна-гульнявая, бяседная). Рэжысёрскае бачанне абрадавай дзеі: вызначэнне звышзадачы, скразнога дзеяння абраду і яго рытуалаў-складнікаў.

*Тэма 19. Сцэнарнае праектаванне абрадавай дзеі*

Структура абраду ў кампазіцыйнай пабудове: пралог, экспазіцыя, завязка, развіццё дзеі, кульмінацыя, развязка, фінал. Сцэнарна-рэжысёрскія ходы ўвасаблення абрадавай дзеі.

Асноўныя прынцыпы сцэнарнага праектавання мастацкай рэканструкцыі абрадавай дзеі: вызначэнне часу і месца правядзення абраду; прастравае рашэнне (мізансцэніраванне) яго этапаў і іх асобных фрагментаў (зоны дзеяння – абрадавыя пляцоўкі, апорныя і перыферыйныя пункты); вылучэнне абрадавых рытуалаў у адмысловыя тэматычныя часткі (музычна-вербальныя блокі); дэталёвае апісанне паслядоўнасці выканання пэўных дзеянняў з адпаведным песенным, вербальным, інструментальным, пластычным, атрыбутыўным суправаджэннем; прымеркаванасць да сакральнай абрадавай часткі свята рэкрэацыйнай пазаабрадавай (танцавальна-гульнявога ігрышча, бяседы з частаваннем). Рэпертуарны зборнік як метадычнае суправаджэнне сцэнарыя.

Сцэнарны фонд сцэнічнай адаптацыі і мастацкай рэканструкцыі беларускіх абрадавых свят (П.А.Гуд, А.А.Хатэнка, А.М.Аляхновіч, М.Ф.Макарцоў, І.І.Сучкоў, А.Я.Камінскі і інш.).

*Тэма 20. Пастановачная работа па ўвасабленні абрадавай дзеі*

Сінкрэтычны падыход да ўвасаблення абраду: у рэчышчы мастацкага рэканструявання, канцэртна-сцэнічнага відовішча.

Поліфункцыянальнасць прафесійнай кампетэнцыі арганізатараў традыцыйнага свята: здольнасць увасобіць сінкрэтызм усіх відаў фальклорнага мастацтва ў абрадавай дзеі як шматпланавай драматычнай партытуры. Кананічнасць адпраўлення абраду паводле рэгіянальнага аўтэнтычнага ўзору і імправізацыя як феномен творчага самавыражэння выканаўцаў.

Рэпетыцыйны працэс з гуртамі-ілюстратарамі абраду. Тыпы рэпетыцый: застольная, планіровачная (т. зв. «у выгарадках»), рэпетыцыя асобных фрагментаў (музычных, харэаграфічных, вербальных), зводная, мантажная, прагонная, генеральная. Праца з гуртамі-ілюстратарамі над дакладным увасабленнем этнафоніі абраду.

Пастановачная работа і мастацкае ўвасабленне абрадавай дзеі. Работа з мастаком, музычным кіраўніком, харэографам па ўвасабленні абраду. Рэжысёрскія прыёмы актывізацыі ўспрымання публікі (вербальная, фізічная, мастацкая актывізацыя).

Вытворча-тэхнічныя пытанні арганізацыі і правядзення дзеі. Складанне каштарыса; выраб элементаў дэкаратыўнага афармлення, касцюмаў; камандзіровачныя выдаткі; харчаванне і размяшчэнне ўдзельнікаў праграмы; прызавы фонд; транспартныя выдаткі, непрадбачаныя выдаткі.

*Тэма 21. Мастацкае рэканструяванне і сцэнічная інтэрпрэтацыя абрадавага і пазаабрадавага фальклору*

Спецыфіка мастацкай рэканструкцыі абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык у гарадскіх умовах. Пастаноўка свята ў дзвюх частках: абрадавай і прымеркаванай танцавальна-гульнявой. Спалучэнне тэхналогій пастановачнай работы і інтэрактыўнага ўзаемадзеяння з гледачом праз найбольш прыдатныя камунікацыйныя формы правядзення абраду (сумеснае выкананне карагода, гульні, песні, танца; антыфонныя спевы, інш.).

Спецыфіка канцэртна-сцэнічнай пастановачнай работы па ўвасабленні абрадавага і пазаабрадавага фальклору. Рэжысёрскае бачанне абрадавай і пазаабрадавай дзеі ва ўмовах сцэны. Прасторавае рашэнне асноўных этапаў і эпізодаў сцэнічна адаптаванай дзеі. Сцэнарнае праектаванне канцэртнай праграмы паводле абрадавага і пазаабрадавага фальклору; стварэнне фальклярызаванай літаратурнай кампазіцыі.

Узоры сцэнічнай інтэрпрэтацыі абрадавага і пазаабрадавага фальклору аматарскімі калектывамі Беларусі.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзелу, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | УСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | | |
| Уводзіны | | 2 | | | | |
| Раздзел І. Метады мастацка-практычнай фалькларыстыкі па засваенні і рэвіталізацыі традыцыйных абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык | | | | | | |
| *Тэма 1.* Абрадавая практыка як арганізацыя мыслення і паводзін традыцыйнага грамадства | | 4 | | 2 | | Вуснае апытанне |
| *Тэма 2.* Эстэтычная і этнаэкалагічная аснова засваення абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык у вучэбна-выхаваўчай і сацыякультурнай дзейнасці | | 2 | | 2 | | Вуснае апытанне |
| *Тэма 3.* Збіранне і даследаванне беларускага фальклору | | 4 | | 2 | 2 | Пісьмовае заданне |
| *Тэма 4.* Методыка даследавання абрадавых традыцый | | 4 | 2 | 2 | 4 | Пісьмовае заданне |
| *Тэма 5.* Аматарская фальклорная дзейнасць як фактар захавання і пераемнасці беларускіх абрадавых і пазаабрадавых традыцый | | 2 | | 2 | | Вуснае апытанне |
| *Тэма 6.* Засваенне традыцыйных абрадаў і свят у аматарскай творчасці | | 4 | | 4 | 2 | Вуснае апытанне |
| *Тэма 7.* Інавацыйныя формы і метады арганізацыі фальклорнай дзейнасці | | 4 | | 4 | 2 | Пісьмовае заданне |
| **Раздзел ІІ. Мастацкая рэканструкцыя каляндарных, сямейна-родавых абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык** | | | | | | |
| *Тэма 8.* Праблемы бытавання і рэканструявання традыцыйных абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык на сучасным этапе | | 4 | | 4 | | Вуснае апытанне |
| *Тэма 9.* Мастацкая рэканструкцыя абрадаў і свят зімовага цыкла | | | 10 | 6 | 4 | Творчы паказ |
| *Тэма 10.* Мастацкая рэканструкцыя абрадаў і свят веснавога цыкла | | | 10 | 6 | 4 | Творчы паказ |
| *Тэма 11.* Мастацкая рэканструкцыя абрадаў і свят летняга цыкла | | | 10 | 6 | 4 | Творчы паказ |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| *Тэма 12.* Мастацкая рэканструкцыя абрадаў і свят летне-восеньскага цыкла | | | 10 | 6 | 4 | Творчы паказ |
| *Тэма 13.* Традыцыі бытавання і перспектывы мастацкага рэканструявання сямейна-родавых абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык | | 4 | | 6 | 4 | Творчы паказ |
| *Тэма 14.* Сістэматызацыя рытуалаў радзінна-хрэсьбіннага абрадавага цыкла | | 2 | 2 | 4 | 4 | Кантрольны урок |
| *Тэма 15.* Сістэматызацыя рытуалаў вясельнага абрадавага цыкла | | 4 | 2 | 4 | 4 | Кантрольны урок |
| *Тэма 16.* Сістэматызацыя абрадавых цырымоній ушанавання продкаў | | 2 | 2 | 4 | 2 | Кантрольны урок |
| *Тэма 17.* Пазаабрадавыя побытавыя практыкі сямейна-родавага цыкла | | 4 | 4 | 4 | 4 | Кантрольны урок |
| **Раздзел III. Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка і ўвасабленне традыцыйных абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык** | | | | | | |
| *Тэма 18.* Рэжысёрскі аналіз традыцыйнага абраду | | 4 | 6 | 10 | 4 | Пісьмовае заданне |
| *Тэма 19.* Сцэнарнае праектаванне абрадавай дзеі | | 2 | 10 | 10 | 4 | Пісьмовае заданне |
| *Тэма 20.* Пастановачная работа па ўвасабленні абрадавай дзеі | | 2 | 14 | | 4 | Тэхнічны залік |
| *Тэма 21.* Мастацкае рэканструяванне і сцэнічная інтэрпрэтацыя абрадавага і пазаабрадавага фальклору | | 2 | 14 | 10 | 4 | Тэхнічны залік |
| **УСЯГО…** | **302** | **48** | **96** | **98** | **60** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. Беларуская вусна-паэтычная творчасць : падручнік для студэнтаў філалалагічных спецыяльнасцей ВНУ / К. П. Кабашнікаў [и др.]. - Мінск : Лексис, 2000. - 512 с.

2. Беларускі фальклор : хрэстаматыя : вучэб. дапаможнік для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей вузаў / склад.: К. П. Кабашнікаў, А. С. Ліс, А. С. Фядосік, І. К. Цішчанка. - Выд. 4-е, перапрац. - Мінск : Вышэйшая школа, 1996. - 856 с.

3. Гуд, П. А. Тэхналогія стварэння свята : вучэб. дапаможнік / П. А. Гуд ; [сярод рэц.: Ю. М. Чарняк]. - [2-е выд., стэр.]. - Мінск : [б. в.], 2008. - 222, [1] с.

4. Камінскі, А. Я. Рэжысура традыцыйнага абраду : вучэб.-метад. Дапаможнік / А. Я. Камінскі ; [сярод рэц.: С. Б. Майсяйчук, В. В. Калацэй]. - Мінск : [б. в.], 2009. - 110, [1] с.

5. Купальскі спеўнік [Ноты] : [метад. дапаможнік] / Інстытут культуры Беларусі ; [аўт. прадм. і уклад. Т. А. Пладунова]. - [2-е выд.]. - Мінск : [Інстытут культуры Беларусі], 2017. - 159 с. : табл., каляр. фат.

6. Кухаронак, Т. І. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял беларускіх свят і абрадаў : вучэб.-метад. дапаможнік / Т. І. Кухаронак, В. Г. Кухаронак. - Мінск : БДПУ , 2005. - 108 с.

*Дадатковая*

1. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыц. жанры: Брэсц. вобл. / склад. В. А. Захарава. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1973. – 301 с.

2. Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыц. жанры: Гомел. вобл. / уклад. В. А. Захарава [і інш.] ; уклад. муз. часткі У. І. Раговіч. – Мінск : Універсітэцкае, 1989. – 384 с. : іл., нот. іл.

3. Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыц. жанры: Мінск. вобл. / уклад. В. Д. Ліцвінка ; уклад. муз. часткі Г. Р. Кутырова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 477 с.

4. Беларускія народныя абрады / склад., навук. рэд. і прадм. Л. П. Касцюкавец. – Мінск : Беларусь, 1994. – 128 с.

5. Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі / В. К. Бандарчык, Л. І. Мінько, Г. І. Каспяровіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 248 с. : іл.

6. Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В. К.

Бандарчык, Л. І. Мінько, Г. І. Каспяровіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 256 с. : іл.

7. Грымаць, А. А. Народная педагогіка беларусаў / А. А. Грымаць, Л. М. Варанецкая, У. В. Пашкевіч. – Мінск : Ул. М. Скакун, 1999. – 256 с.

8. Ліцвінка, В. Д. Святы і абрады беларусаў / В. Д. Ліцвінка. Мінск : Беларусь, 1997. – 176 с. : іл.

9. Сучкоў, І.І. Фальклорны тэатр беларусаў: праблемы паэтыкі і эстэтыкі / І.І. Сучкоў. – Мінск: Выд-ва БДУК, 2004. – 306 с.

10. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6т. Т. 1. Магілёўскае Падняпроўе / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка і інш. – Мн.: Бел. навука, 2001. 797 с.

11. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6т. / Т. Б. Варфаламеева [і інш.]; склад. Т. Б. Варфаламеева. – Мн.: Бел. навука, 2004. – Т. 2. Віцебскае Падзвінне. - 910 с.

12. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6т. Т. 3. Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]; аўт. ідэі Т. Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2006. 608 с. : каляр. іл.

13. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6т. Т. 3. Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 2 / В. І. Басько [і інш.]; аўт. ідэі Т. Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2006. 608 с. : каляр. іл.

14. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: У 6 т. Т. 4 Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінк : Выш. шк., 2008. – 559 с. : каляр. іл.

15. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 4. Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2009. – 863 с. : каляр. іл., 1 электрон.-апт. Дыск (CD-Rom).

16. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 5. Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2010. – 847 с. : каляр. іл.

17. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: У 6 т. Т. 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе. У 2 кн. Кн. 1 / Т.В.Валодзіна [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінк : Выш. шк., 2012. – 910 с. : каляр. іл.

**Метадычныя і рэпертуарныя зборнікі**

1. Беларускі фальклор у школе: дапам. для настаўніка / І. І. Сучкоў, Ф. І. Таранава, Л. У. Рута, В. В. Куржалава. – Мінск : Нар. асвета, 1996. – 176 с.

2. Беларускія народныя танцы, карагоды і гульні / уклад. В. С. Семенякоў.

– Мінск : БелСЭ, 1989. – 125 с.

3. Беларускія традыцыйныя абрады і святкаванні: метад. рэк. для сярэдніх спец. нав. установ. – Мінск, 1991. – 28 с.

4. Гуд, А.П. Ад Каляд да Пакроваў / А.П. Гуд – Мінск : ВТАА «Красіка-Прынт», 2000. – 223 с.

5. Гуд П. А., Гуд Н. І. Беларускі кірмаш. – Мн.: Полымя, 1996. – 270 с.: іл.

6. Штудыі Рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы / уклад. В.В. Калацэй; рэд.кал. В. Калацэй (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2007. – 72 с.: іл.

*Кіна- , відэаграфія*

*1.* Голоса веков / сцен. З. Можейко. – Беларусьфильм, ВА «Летапіс», 1979.

*2.* Память столетий / сцен. З. Можейко. – Беларусьфильм, ВА «Летапіс», 1982.

*3.* Пранясі, Божа, хмару / сцэн. З. Мажэйкі. – Беларусьфільм, ВА «Летапіс», 1990.

*4.* Рух зямлі / сцэн. З. Мажэйкі. – Беларусьфільм, ВА «Летапіс», 1999.

*5.* Мужчынскі рой / сцэн. Г. Тавлай, рэж. С. Гайдук. – РУП «Белвідыяцэнтр», 1995.

*6.* Мотальскія байкі / сцэн. і рэж. В. Пестаў. – РУП «Белвідыяцэнтр», 1990.

*7.* Карагод / сцэн. М. Козенка, рэж. і апер. А. Шклярэўскі. – РУП «Белвідыяцэнтр», 1995.

*8.* Беларускае адзенне / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча. – ТА «Радавод» Белтэлерадыёкампаніі, 1998.

*9.* Былічкі / сцэн. Р. Гамзовіч. – ТА «Радавод» Белтэлерадыёкампаніі, 1996.

*10.* Вяселле ў Моталі. Абрад «свахі» / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. М. Зарэмба. – ТА «Радавод» Белтэлерадыёкампаніі, 1998.

*11.* Жураўка / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча. – ТА «Радавод» Белтэлерадыёкампаніі, 1999.

*12.* Культ продкаў / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча. – ТА «Радавод» Белтэлерадыёкампаніі, 1997.

*13.* Культ продкаў / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча. – ТА «Радавод» Белтэлерадыёкампаніі, 1998.

*14.* Стравы на Дзяды / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча. – ТА «Радавод» Белтэлерадыёкампаніі, 1998.

***Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі***

Для выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па вучэбнай дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка вярбальных і мультымедыйных прэзентацый;

– падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);

– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;

– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;

– пашпартызацыя і сістэматызацыя фальклорных узораў;

– складанне «абрадавай карты» паводле кодаў абрадавай дзеі на рэгіянальнай дакумнтальнай аснове;

– сцэнарнае праектаванне абрадавай (пазаабрадавай) дзеі;

– прэзентацыя мастацкай рэканструкцыі абрадавай (пазаабрадавай) дзеі;

– сцэнарнае праектаванне і прэзентацыя канцэртнай, інтэрактыўнай праграмы, канцэрта-лекцыі паводле традыцыцыйных відаў фальклору;

– вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па распрацаваных тэмах;

– залік;

– экзамен;

– курсавая работа.

***Метады і тэхналогіі навучання***

З ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання па вучэбнай дысцыпліне «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці», якія садзейнічаюць набыццю студэнтамі ведаў у галіне беларускага фальклору і фарміраванні ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач у русле мастацка-практычнай фальклардыстыкі, вылучаюцца наступныя:

– тэарэтычныя і агульналагічныя метады (сістэматызацыя, класіфікацыя, параўнальны аналіз, сінтэз, абагульненне);

– метады тлумачальна-ілюстрацыйны ў спалучэнні з рэпрадуктыўным;

– метад этнаграфічнага даследавання;

– метады уключанага назірання і дэманстрацыйнай антрапатэхнікі;

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці і праектныя тэхналогіі.

На практычных занятках мэтазгодна прымяняць:

– інтэрактыўныя метады навучання: работу з дыдактычнымі матэрыяламі, дыскусіі і абмеркаванні, трэнінгі і рэжысёрскія эцюды;

– праектаванне канцэртных праграм і народна-тэатральных пастановак, інтэрактыўных танцавальна-гульнёвых праграм і канцэртнага лекторыя паводле традыцыцыйных відаў фальклору;

– дэманстрацыю мультымедыйных прэзентацый, праслухоўванне і прагляд аўдыё- і відэаматэрыялаў, працу з рэсурсамі сеткі Інтэрнэт, электроннымі энцыклапедыямі і інш.

Важным уяўляецца і ўлік міждысцыплінарных сувязяў. Пастаянны зварот да іншых тэарэтычных і практычных дысцыплін дазволіць растлумачыць навучальны матэрыял і замацаваць заняткі, якія засвойваюцца студэнтамі.

***Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай працы студэнта***

Самастойная работа студэнтаў садзейнічае паглыбленню іх ведаў, пашырэнню кругагляду, фарміраванню навыкаў самастойнага пошуку і апрацоўкі інфармацыі, выпрацоўцы творчага падыходу да тэарэтычнага асваення і практычнага ўвасаблення матэрыялу па тэмах вучэбнай дысцыпліны.

Самастойная работа студэнтаў у рамках вучэбнай дысцыпліны «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці» уключае ў сябе наступныя формы:

– выкарыстанне відэа-і аўдыёматэрыялаў;
– падрыхтоўка да групавых заняткаў і іспыту;
– складанне абрадавай карты свята
– складанне рэперуарных зборнікаў, аўдыё-відэатэкі
– сцэнарна-рэжысёрская распарацоўка свята, побытавай дзеі
– пастановачны план і падрыхтоўка святочных, побытавых, канцэртных і інтэракыўных фальклорных праграм.

Вывучэнне матэрыялу вучэбнай дысцыпліны мае на ўвазе працу студэнтаў з фалькларыстычнымі выданнямі, экспедыцыйнымі аўдыё-і відэаматэрыяламі, інфармацыйнымі рэсурсамі сеткі Інтэрнет. Вывучэнне дадатковых матэрыялаў па індывідуальным спісе (з улікам базавай адукацыі).

Выкарыстанне відэа- і аўдыёматэрыялаў – адна з важных форм самастойнай працы ў рамках навучальнай дысцыпліны «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці». Яно заключаецца ў пошуку, праглядзе, аналізе этнаграфічных фальклорных матэрыялаў, а таксама інавацыйных пост-фальклорных праектаў і фальклорных фестываляў, рэалізаваных на аснове традыцыйнага рэгіянальнага фальклору - дзеля стварэння ўласнай творчай распрацоўкі ў русле рэвіталізацыі яскравых праяў народнай спадчыны.

Самастойная работа выконваецца ў любой рэкамендаванай форме па агульным напрамку «Рэгіянальная разнастайнасць прыярытэтаў фальклорнай дзейнасці ў аматарскай творчасці».

***Формы выканання самастойнай работы:***

– Напісанне рэферату;
– Распрацоўка аўдыёвізуальнай прэзентацыі;
– Пашпартызацыя і сістэматызацыя фальклорных узораў (абрадавая карта свята);
– Сцэнарнае праектаванне абрадавай (пазаабрадавай) дзеі;

– Складанне рэпертуарнага зборніка, аўдыё-відэатэкі да мастацкай рэканструкцыі абрадавай (пазаабрадавай) дзеі;

– Распрацоўка палажэння свята, фестывалю.

# КРЫТЭРЫІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

| Адзнака | Паказчыкі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. Невыкананне практычных заданняў па дысцыпліне |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. Невыкананне практычных заданняў па дысцыпліне |
| 3 (тры) | Аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу па памяці. Ізаляванасць ведаў па асобных тэмах. Нездавальняючае выкананне практычных заданняў па дысцыпліне |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (крытэрыяў сістэматызацыі і пашпартызацыі фальклорнага матэрыялу). Веданне навукова-метадычнай літаратуры. Наяўнасць істотных памылак у арганізацыі фальклорнай дзейнасці. Нездавальняючае выкананне практычных заданняў па дысцыпліне |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (спецыфікі арганізацыі фальклорнай дзейнасці; сцэнарнага праектавання і рэжысуры традыцыйных абрадаў і побытавых практык). Наяўнасць неістотных памылак у арганізацыі фальклорнай дзейнасці |
| 6 (шэсць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне асноўнай навуковай літаратуры і метадычнага фонду па дысцыпліне. Наяўнасць неістотных памылак у арганізацыі фальклорнай дзейнасці |
| 7 (сем) | Поўныя, трывалыя веды. Разгорнутае апісанне і тлумачэнне аб'ектаў вывучэння, раскрыццё праблем арганізацыі фальклорнай дзейнасці. Уменне аналізаваць вучэбны працэс. Наяўнасць неістотных памылак у арганізацыі фальклорнай дзейнасці |
| 8 (восем) | Поўныя, трывалыя, глыбокія веды, уменні і навыкі па арганізацыі фальклорнай дзейнасці ў розных сацыяльна-ўзроставых групах. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў і практычнай скіраванасці дысцыпліны, пацверджанае аргументамі і фактамі. Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне, аўдыявідэаграфіі фальклору. Наяўнасць неістотных памылак у арганізацыі фальклорнай дзейнасці |

| | |
|---|---|
| 9 (дзевяць) | Усведамленне студэнтам форм і метадаў мастацка-практычнай фалькларыстыкі, акрэсленых у сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў і практычнай скіраванасці дысцыпліны, пацверджанае аргументамі і фактамі. Уменне самастойна ажыццяўляць працэс арганізацыі фальклорнай дзейнасці на высокім культуралагічным і мастацкім узроўні. Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры, аўдыявізуальных этнаграфічных матэрыялаў па дысцыпліне і ўменне карыстацца імі па акрэсленых пытаннях |
| 10 (дзесяць) | Глыбокае асэнсаванне праблем арганізацыі фальклорнай дзейнасці ў сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы. Разуменне студэнтам агульнатэарэтычных пытанняў і практычных захадаў па ахове і пераемнасці традыцыйнай культуры на сучасным этапе. Уменне прымяняць свае веды, уменні і навыкі ў кантэксце прафесійнай дзейнасці, аналізаваць з'явы бытавання і трансфармацыі традыцыйнай культуры, карыстацца навуковай літаратурай па традыцыйнай культуры, праблемах і перспектывах яе бытавання і асэнсавання. Студэнтам прапанаваны ўласныя інавацыйныя падыходы ў арганізацыі фальклорнай дзейнасці ў сучасным урбанізаваным грамадстве. |

| | |
|---|---|
| 9 (дзевяць) | Усведамленне студэнтам форм і метадаў мастацка-практычнай фальклярыстыкі, акрэсленых у сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў і практычнай скіраванасці дысцыпліны, пацверджанае аргументамі і фактамі. Уменне самастойна ажыццяўляць працэс арганізацыі фальклорнай дзейнасці на высокім культуралагічным і мастацкім узроўні. Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры, аўдыявізуальных этнаграфічных матэрыялаў па дысцыпліне і ўменне карыстацца імі па акрэсленых пытаннях |
| 10 (дзесяць) | Глыбокае асэнсаванне праблем арганізацыі фальклорнай дзейнасці ў сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы. Разуменне студэнтам агульнатэарэтычных пытанняў і практычных захадаў па ахове і пераемнасці традыцыйнай культуры на сучасным этапе. Уменне прымяняць свае веды, уменні і навыкі ў кантэксце прафесійнай дзейнасці, аналізаваць з’явы бытавання і трансфармацыі традыцыйнай культуры, карыстацца навуковай літаратурай па традыцыйнай культуры, праблемах і перспектывах яе бытавання і асэнсавання. Студэнтам прапанаваны ўласныя інавацыйныя падыходы ў арганізацыі фальклорнай дзейнасці ў сучасным урбанізаваным грамадстве. |